**Прайсці** праз вайну / падрыхт. У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2009. — 14 лют. — С. 4.

## ПРАЙСЦІ ПРАЗ ВАЙНУ



Яны раслі звычайнымі падлеткамі, хто ў вёсцы, а хто – у горадзе. Хадзілі за плугам, размахвалі касою на росным ранішнім лузе, а ўвечары беглі на дыскатэку. Яны раслі рамантыкамі пад мірным небам, цёплымі летнімі начамі любаваліся светлымі і яснымі зорамі. Яны смяяліся і хваляваліся, сябравалі і кахалі, жылі і вельмі любілі жыццё, мужнелі проста на вачах, з падлеткаў вырасталі ў юнакоў, мелі грандыёзныя планы на будучыню і не ведалі, што заўтра ім давядзецца прайсці праз... вайну!

...Коля жыў на самым ускрайку раёна – за лесам. Там, на мяжы з Барысаўшчынай, прытулілася сціплая вёсачка Багданава, адкуль да Чашнік было ці не далей, чым да Барысава. Хлопец і ў школу бегаў у суседнюю Майсееўшчыну, вёску, якая ўжо іншага раёна. А скончыўшы дзесяцігодку, падаўся ў Лепель, каб як найхутчэй, усяго за тры месяцы, вывучыцца на вадзіцеля і вярнуцца ў родную гаспадарку. І быць бы яму шафёрам, і працаваць бы ўсё жыццё ў саўгасе, як працавалі яго маці-цялятніца і бацька-цясляр, калі б не вайна тая...

З паўгода пакруціў баранку – і ўзялі ў войска. Ішоў восемдзесят першы год, і калі навабранца накіравалі ў вучэбку ва Узбекістан, стала ўсё зразумела. Зрэшты, ад іх, маладых воінаў, і не хавалі, што рыхтуюць на вайну. Жылі ў палявых умовах у палатачным гарадку, часта бывалі на стрэльбах, іх вучылі вадзіць машыны ў складаных начных умовах, ганялі да знямогі на кросах. Аднойчы нават блізка падышлі яны да дзяржаўнай мяжы з Афганістанам, што праходзіла па рацэ Амудар’і. Іх як бы рыхтавалі маральна да сустрэчы з невядомаю краінаю.

А неўзабаве на верталётах і сапраўды перакінулі на поўдзень Афганістана, у горад Кундуз, дзе давялося служыць Мікалаю Драгуну два гады. Для вайны гэта вельмі вялікі тэрмін. І было за гэты час усяго, і здаралася ўсялякага. Помніцца Мікалаю першае «баявое хрышчэнне». Калона іхняя выйшла на пласкагор’е, спусцілася нізам да вёскі і нечакана трапіла пад абстрэл. Навічкі, яны раптам разгубіліся, не ведалі, што рабіць, пакуль ініцыятыву не ўзялі старaслужачыя, скамандаваўшы хавацца за колы, на ўзбочыне ды займаць баявыя пазіцыі. На гэты раз усё абышлося, але ж наперадзе былі яшчэ два гады вайны. Добра запомніўся нашаму герою і апошні яго афганскі бой. Калону абстралялі, падбілі БМП, затым па іншых машынах сталі весці прыцэльны агонь з гранатамётаў. Побач з Мікалаем быў яго добры сябар казах Даніжбек, якога хлопцы называлі проста Толем. Перад іхняю машынаю ехаў «Урал». Прамым пападаннем з гранатамёта яму адбілі борт. Нашы ж хлопцы паспелі прытармазіць, гэта і выратавала ім жыццё. А паміраць так не хацелася, наперадзе ўжо рэальна маячыў «дэмбель». Сам жа дзень, калі прыйшоў час яго дэмабілізацыі, падаўся Мікалаю звычайным і будзённым. Проста прыляцела «вяртушка», і хлопцы зразумелі, што для іх, на шчасце, усё заканчваецца... Дарэчы, Мікалай сустрэў тут, у Кундузе

свайго земляка, чашнічаніна Міхаіла Касцянку. Міша толькі пачынаў служыць – яму не пазайздросціш.

Міхаіл таксама вярнуўся з вайны жывым і здаровым. Нашы хлопцы, пазбегшы раненняў, шчасліва вярнуліся дадому.

Мікалай Леанідавіч ужо шмат гадоў працуе інкасатарам. Прафесія ў яго, сказаць шчыра, хоць і мірная, але экстрэмальная. Не прывыкаць Драгуну да экстрэмальных сітуацый. Чалавек праз вайну прайшоў…

Вырас сын Андрэй. Ён зараз служыць у рэзерве. Бацька паблажліва пасмейваецца, маўляў, хіба гэта служба! А ў глыбіні душы Мікалай задаволены, што сыну й пашчасціла размінуцца з вайною. Бо хоць і робіць вайна з нашых хлопцаў сапраўдных мужчынаў, ды лепей усё ж праходзіць навуку мужнасці на пляцы ды на вучэннях, чым на горных дарогах чужой краіны. Вайна не выбірае…

**На здымку:** Драгун Мікалай